

Фота Юрыя ШАНОВА.

Мемарыяльны комплекс Дальва.

Хрышчоны Дальвай

Упершыню імя Уладзіміра ЦЕРАБУНА стала шырока вядомым у 1973 годзе, калі ён стварыў на Міншчыне, недалёка ад Хатыні, мемарыяльны комплекс "Дальва". З той пары з-пад яго разца выйшлі дзесяткі таленавітых твораў: станковых і манументальных скульптур, кампазіцый са шкла і металу ў інтэр'ерах грамадскіх будынкаў, мемарыяльных дошак,графічных аркушаў "Ракурс", вырабаў з керамікі. Больш за 50 сваіх работ ён перадаў у падарунак музеям Гродна, Смаргоні, Оршы, Ліды, в.Гудзевічы Мастоўскага раёна.

Галоўныя тэмы мастака — хада часу, Радзіма, яе гісторыя і дзень сённяшні, подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай, месца Чалавека на Зямлі, філасофія чалавечай любові і надзеі, смутку і радасці, дабра і зла...

Напярэдадні юбілею мастака наш карэспандэнт сустрэўся з ім, і вось такая атрымалася гутарка.

— Уладзімір, адзін аднаго мы ведаем ужо амаль што 30 гадоў, пачынаючы з тваёй абароны дыплома ў БДТМІ — праекта мемарыяла "Дальва". Потым шмат разоў сустракаліся ў Гродне, дзе ты восем гадоў узначальваў абласную арганізацыю Саюза мастакоў. У апошнія 5 гадоў ты жывеш і працуеш у Мінску. Тут і сустракаеш свой 60-гадовы юбілей.

— Вядома, у такіх выпадках заўсёды вяртаешся памяццю ў мінулае і задаеш сабе шэраг пытанняў: што вартае зроблена, ці тым шляхам ішоў, ці шмат было памылак у жыцці і творчасці? Для мяне галоўным у мастацтве было тое, што кожны раз я намагаўся адкрыць нешта ў сабе, і калі гэта ўдавалася, атрымліваў вялікую асалоду ад створанага. Гэта не азначае нейка-га самалюбавання сваімі творамі.

— Мяне заўсёды цікавіла такое пытанне: як, з чаго пачынаецца творца: мастак, паэт, музыкант, артыст? Дар, талент чалавеку даецца з неба, Богам, ці — генамі бацькоў, ці адпаведным жыццёвым акружэннем, наваколлем?

— На гэтыя пытанні немагчыма адказаць. Гэта таксама вялікая таямніца. Што тычыцца мяне, дык я нарадзіўся ў вёсцы Нецяняты Смаргонскага раёна, а потым, калі мне было 4 гады, сям'я пераехала на хутар Свірыдовічы, пад Смаргонь. Бацькоўскіх генаў, відаць, не было. Бацька Васіль Карнілавіч — піпаточ на лесазаводзе, маці — Антаніна Антонаўна — хатняя гаспадыня, якая нарадзіла шасцярых дзяцей. Сёння нас толькі трое: брат Юрый — музыкант у Маладэчне і другі брат Міхаіл — вайсковец, у адстаўцы, жыве ў Варонежы, і я. І ўсё ж скажу так: першым маім ускосным настаўнікам у мастацтве быў менавіта бацька. Ён заўсёды прывозіў дадому дровы, дакладней, абрэзкі дошак, і гэтыя дошкі —з іх рабілі тару — былі такія цудоўныя, прыгожыя, што самі "прасіліся" пад нож. І я з братам вырэзваў усё, чаго душа жадала: ад чалавечых фігурак, планёраў і паветраных змеяў да цымбальных футаралаў. Бацька мне казаў: "Калі добра выражаш галаву, дык потым атрымаешся і ўсё астатняе...".

— А што дала табе школа як будучаму мастаку?

— Шмат што. Я вучыўся ў цудоўнай беларускай сярэдняй школе. Там, акрамя агульнаадукацыйных дысцыплін, вывучаў прафесіі сталяра і шафёра, навучыўся іграць на балалайцы і цымбалах, іграў у Смаргонскім аркестры ансамбля імя Агінскага. З тых гадоў з цеплынёй успамінаю майго настаўніка працы Віктара Раленку і народнага майстра з Залесся Івана Жываева, які навучыў мяне ляпіць з гліны і фармаваць... Ну, а пасля службы ў арміі я паступіў у тэатральна-мастацкі інстытут, дзе вучыўся ў Андрэя Бембеля і Генадзя Мурамцава.

— Як ты прыйшоў да задумы стварыць такі вельмі сур'ёзны і адказны дыпломны праект, як "Дальва"?

— Калі я быў яшчэ на 3 курсе, да Бембеля прыйшоў Мікалай Пятровіч Грыпловіч, адзіны ўцалелы жыхар спаленай фашыстамі Дальвы. Папрасіў зрабіць на месцы гэтай вёскі мемарыяльны знак. І Андрэй Ануфрыевіч абгаварыў студэнцкі конкурс. З чатырох праектаў кафедра скульптуры выбрала мой. І я два леты — на 4 і 5 курсе — рабіў гэты праект проста там, за 7 кіламетраў ад былой Дальвы, у сайгасе "Іскра", у пуні. І калі зрабіў у гліне 4-метровую мадэль, прыехала камісія на чале з Бембелем, і маю працу ўхваліла. Дыплом, як ты ведаеш, я абаранёў на "выдатна", і 19 чэрвеня 1973 года адбылося адкрыццё гэтага мемарыяла.

— А праз тры гады ты за гэты твор атрымаў прэмію Ленінскага камсамола Беларусі...

— Так. Але тады я ўжо пераехаў у Гродна, дзе пражыў 27 гадоў. Гэтыя гады, як кажуць, даромна не прапалі. Яны далі магчымасць правесці шэраг эксперыментаў крутлай і рэльефнай скульптуры, у выкапцыі з металу, у скульптуры з мазаікай, у кампазіцыях са шкла, керамікі і металу, пазней зацікавіўся акварэллю, алейным жывапісам, графікай.

— Ёсць такая думка, што калі мастак працуе ў шматлікіх накірунках, дык ніводзін з іх не будзе дасканалым.

— Можа й так, але я ніколі не рабіў таго, да чаго не ляжала душа, тым больш — не імкнуўся здзіўляць кагосьці. Імкнуўся ўсё ў жыцці даказваць самому сабе і сваім сябрам. Самавыказванне — гэта мой накірунак у творчасці, а справа ўжо крытыкаў ацэньваць тое, што я стварыў.

— Ведаю, што ў цябе было шмат персанальных выставак, не кажучы пра буйныя помнікі ў Гродне, Смаргоні, Слуцку...

— Так, мае творы экспанаваліся як на Беларусі, так і за мяжой — у Гродне, Мінску, Маскве, Ленінградзе, Зеленаградзе, Таліне, Друскеніках, Панявежыскі, Варшаве, Ростаку, Міндэне... Яны заўсёды даюць магчымасць не толькі паказаць свае знаходкі, пошукі, магчыма, пралікі, але і прааналізаваць зробленае, зрабіць якіясьці высновы, акрэсліць свой заўтрашні шлях.

— Што ў цябе сёння на станку ў майстэрні?

— Працую над скульптурнымі кампазіцыямі-праектамі "Дрэва жыцця" для Вялікай Бераставіцы і "Слуцкія паясы" — для г.Слуцка, распрацаваў манументальны трыпціх, прысвечаны Адаму Міцкевічу. Планую правесці персанальныя выстаўкі на радзіме ў Смаргоні, потым — у Гродне, а восенню, мабыць, і ў Мінску. Прадстаўлю, канешне, скульптуру, графіку, кераміку, жывапіс, фотаматэрыял.

Словам, у сваёй творчасці я імкнуся паказаць не толькі прыгажосць, хараство сваіх мадэлей, але і ўнутраны стан душы чалавека, каб давесці твор да вобраза-знака, вобраза-сімвала, вобраза-метафары.

Скульптурная кампазіцыя "Прысвячэнне А.Міцкевічу".

Гутарыў
Барыс КРЭПАК